# Дэкада навукі 2024: рэзультаты ФМк

**Традыцыйна ў першай палове красавіка ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце праводзіцца Дэкада студэнцкай навукі. Расказваем, як яна прайшла ў 2024 годзе.**

Дэкада студэнцкай навукі “Моладзь у навуцы і бізнесе” – гэта традыцыйны для БДЭУ комплекс мерапрыемстваў, накіраваны на развіццё навуковага патэнцыялу, прадпрымальніцкіх здольнасцей і дзелавой актыўнасці студэнтаў.

У межах Дэкады праходзяць навуковыя канферэнцыі, круглыя сталы, фестывалі і форумы. Не трэба палохацца слова «навуковы». Для студэнтаў навука – гэта не нудныя даследаванні і справаздачы, а спосаб паглыбіцца ў цікавую ім тэму, прапанаваць свае ідэі і атрымаць прызнанне ў якасці маладога даследчыка.

**У 2024 годзе ў межах Дэкады было праведзена 8 мерапрыемстваў:**

• Конкурс «Лепшая студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя БДЭУ-2024»

• Конкурс бізнес-ідэй і праектаў «Маркет ідэй»

• 17-я Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў «Нацыянальная эканоміка Рэспублікі Беларусь: праблемы і перспектывы развіцця»

• 2-я Міжнародная студэнцкая навуковая канферэнцыя «Экана-2024: сусветная эканоміка і міжнародны бізнес»

• Міжуніверсітэцкая студэнцкая навуковая канферэнцыя «Юрыдычная клініка – школа набыцця практычных навыкаў юрыста»

• Дні партнёрскага ўзаемадзеяння

• Сустрэчы з прадстаўнікамі органаў дзяржаўнага кіравання, кампаній і арганізацый, круглыя сталы і майстар-класы з удзелам лепшых выкладчыкаў універсітэта

## Вынікі ФМК

У межах конкурсу «Лепшая СНДЛ БДЭУ-2024» лабараторыя «PR» кафедры прамысловага маркетынгу і камунікацый стала лепшай у намінацыі **«Лепшы навукова-даследчы праект у галіне інтэрнет-прасторы і лічбавай трансфармацыі эканомікі».**

Навукова-практычная канферэнцыя на ФМК была прадстаўлена секцыяй 7 **«Праблемы і перспектывы развіцця маркетынгу і лагістыкі».** Студэнты прадставілі свае даклады ў 5 падсекцыях.

**Падсекцыя**
**7.1 Тэарэтычныя асновы маркетынгу (для даследчыкаў-пачаткоўцаў)**

**1 месца** Яглінская Дар'я Анатольеўна. Тэма: «Метады ацэнкі пазнавальнасці брэнда».
**2 месца** Міско Аліна Алегаўна, Якавіцкая Ганна Сяргееўна. Тэма: «Кантэксная рэклама ў сферы адукацыі (на прыкладзе УА "БДЭУ")».
**3 месца** Банчук Кацярына Міхайлаўна, Раманчук Аляксандра Аляксандраўна. Тэма: «Падкасты як інструмент прасоўвання ў лічбавым маркетынгу»
**Дыплом** «**Прызнанне**» Гмір Святаслаў Сяргеевіч. Тэма: «Рэклама ў футболе»

**Падсекцыя 7.2 Прыкладныя пытанні B2B маркетынгу**

**1 месца** Бяляшова Марыя Дзмітрыеўна, Сілевіч Дыяна Аляксандраўна. Тэма: «Выкарыстанне ШІ для прасоўвання брэнда ў B2B-сегменце з дапамогай халодных рассылак»
**2 месца** Белановіч Павел Сяргеевіч. Тэма: «Выкарыстанне Штучнага Інтэлекту ў галіне B2B»
**3 месца** Бурмялёва Ангеліна Андрэеўна, Вайтовіч Наталля Андрэеўна. Тэма: «LinkedIn як інструмент камунікацый B2B-сферы».
**Дыплом «Прызнанне»** Бондарава Ганна Сяргееўна. Тэма: «Брэнд “Луч” і спосабы яго прасоўвання»

**Падсекцыя** 7.3 Прыкладныя аспекты маркетынгу ў эпоху лічбавых тэхналогій

**1 месца** Дулевіч Мікіта Андрэевіч, Краўцова Марыя Мікалаеўна, Кіжук Ксенія Аляксандраўна. Тэма: «Праект для Беларусі: тэрыторыя зносін – пляцоўка для камунікацый міжнародных студэнтаў»
**2 месца** Гаркун Паліна Андрэеўна, Сінюковіч Дар’я Мікалаеўна. Тэма: «Карыстальніцкі кантэнт як інструмент прасоўвання прадукту»
**3 месца** Гусарава Марыя Мікалаеўна, Васільева Арына Дзмітрыеўна. Тэма: «Роля кантэнт-маркетынгу ў дасягненні лаяльнасці кліентаў»
**Дыплом «Прызнанне»** Барталевіч Кацярына Дзмітрыеўна. Тэма: «Агенты ўплыву ў прасоўванні брэндаў»

**Падсекцыя 7.4 Сучасныя маркетынгавыя камунікацыі**

**1 месца** Яўсеева Яніна Міхайлаўна. Тэма: «Развіццё чат-ботаў і

іх роля ў паляпшэнні ўзаемадзеяння з кліентамі ў маркетынгу»
**2 месца** Дарашкова Варвара Андрэеўна. Тэма: «Інтэрактыўная рэклама як сучасны сродак камунікацыі на прыкладзе прадпрыемства ААТ «Камунарка»»
**3 месца** Кардаш Ганна Андрэеўна, Міхневіч Юлія Валер’еўна. Тэма: «Эмбіент-медыя як новая форма рэкламы»
**Дыплом «Прызнанне»** Дарашкова Варвара Андрэеўна. Тэма: «Інтэрактыўная рэклама як сучасны сродак камунікацыі на прыкладзе прадпрыемства ААТ «Камунарка»»

**Падсекцыя 7.5 «Лагістыка і кіраванне ланцугамі паставак»**

**1 месца** Нічыпаравіч Данііл Эдуардавіч, Кучаравы Антон Аляксандравіч. Тэма: «Асаблівасці і праблемы ажыццяўлення міжнародных перавозак пад мытным кантролем»
**2 месца** Жабінская Юлія Анатольеўна, Каваленка Ангеліна Васільеўна. Тэма: «Генератыўны штучны інтэлект: новы спосаб павышэння эфектыўнасці працэсаў закупачнай лагістыкі»
**3 месца** Мяшкова Кацярына Вітальеўна, Захарчук Марыя Мікалаеўна. Тэма: «Роля лагістыкі ў дасягненні мэт устойлівага развіцця»
**Дыплом «Прызнанне»** Захлебны Кірыл Алегавіч. Тэма: «Беспілотны аўтамабільны транспарт у лагістыцы»

Па выніках канферэнцыі прайшоў круглы стол **“Праблемы і перспектывы развіцця маркетынгу і лагістыкі”**. На ім пераможцы секцый прадставілі свае даклады і пазмагаліся за званне «лепшых з лепшых». Месцы размеркаваліся наступным чынам:
**1 месца** Дарашкова Варвара Андрэеўна. Тэма: «Інтэрактыўная рэклама як сучасны сродак камунікацыі на прыкладзе прадпрыемства ААТ «Камунарка»»
**2 месца** Яўсеева Яніна Міхайлаўна. Тэма: «Развіццё чат-ботаў і іх роля ў паляпшэнні ўзаемадзеяння з кліентамі ў маркетынгу»
**3 месца** Міско Аліна Алегаўна, Якавіцкая Ана Сяргееўна. Тэма:

«Кантэксная рэклама ў сферы адукацыі (на прыкладзе УА «БДЭУ»)»

Асаблівай падзеяй у межах Дэкады навукі для ФМК стаў III Моладзевы лагістычны форум «Будучыня лагістыкі». Кожны год студэнты-лагісты і прадстаўнікі буйных транспартных кампаній збіраюцца, каб абмеркаваць апошнія трэнды сферы.

**16 красавіка** адбыўся бізнэс-мітап «Лагістыка сёння і заўтра». На ім выступілі спецыялісты-практыкі ў сферы лагістыкі з 8 буйных кампаній. Тут студэнты змаглі даведацца пра актуальныя тэндэнцыі ў сферы і больш пра прафесію ўвогуле.

**19 красавіка** адбудзецца заключны этап Алімпіяды. Каманды, якія лепш за ўсіх справіліся з папярэднімі этапамі – рашэннем кейса і тэсціраваннем – прадставяць свае праекты перад удзельнікамі Форуму.

## Вынікі

Навука на ФМК – важная частка адукацыйнага працэсу. Яна дазваляе будучым спецыялістам вызначыць іх сферы цікавасці і развіць практычныя навыкі ўжо зараз. Мы дзякуем усім удзельнікам за актыўную працу ў межах мерапрыемстваў, а таксама віншуем пераможцаў з заслужанымі ганаровымі месцамі на канферэнцыі.